# Словы, аднолькавыя па гучанні, розныя па значэнні

**170.** Разгледзьце малюнкі. Як па-руску называюцца прадметы і з’явы, адлюстраваныя на малюнках?



Дыван, канапа, гарбуз, кавун, качка, гайда́нка.

Як можна падпісаць кожны з малюнкаў па-беларуску?

**?!** Чаму трэба быць уважлівымі пры выкарыстанні гэтых слоў?

Вусна складзіце з імі сказы.

**У беларускай і рускай мовах ёсць словы, падобныя або аднолькавыя па гучанні, але розныя па значэнні.**



Правообладатель Национальный институт образования

**171.** Дапоўніце сказы патрэбнымі словамі з правага слупка. Запішыце два сказы на выбар.

1. Вадаплаўная птушка з шырокай дзюбай, кароткай шыяй і кароткімі лапамі — гэта ... .
2. Гайданне судна пры хваляванні мора — гэта ... .
3. Гладкая бліскучая паверхня, здольная даваць адбіткі тых прадметаў, якія знаходзяцца перад ёй, — гэта ... .
4. Асобнае памяшканне для жылля ў кватэры, доме — гэта ... .

люстра

качка

гайданка

пакой

**Будзьце ўважлівыя!**

| у беларускай мове | у рускай мове |
|---|---|
| рэч | вещь |
| мова | речь |
| качка | утка |
| гайданка | качка |
| справа | дело |
| гасцінец | дорога |
| благі | плохой |
| добры | благой (хороший) |
| пакой | комната |
| спакой | покой |



Правообладатель Национальный институт образования

**172.** Прачытайце і адгадайце загадку.



Падарунак сябруку
служыць назвай бальшаку.
*У. Мазго.*



Запішыце загадку разам з адгадкай.

**173.** Дапоўніце сказы слоўнікавым словам.

… — ласунак, які госць або блізкі падносіць у падарунак гаспадарам.

… — вялікая бойкая дарога, звычайна абсаджаная дрэвамі.

**гасці́нец**

**174.** Дапішыце па адным слове ў кожную групу сінонімаў.

1. Дарога, шлях, бальшак, … .
2. Падарунак, дарунак, дар, … .

**175.** Прачытайце. Які настрой перадаецца ў вершы: сур’ёзны ці жартоўны?

Чаравічкі ў нашай Славы —
адзін левы, другі правы.
Справа — левы,
злева — правы.
— Скажы, Слава,
у чым справа?



Правообладатель Национальный институт образования

— Тут маёй няма віны:
паспрачаліся яны.

*А. Пысін.*

Спішыце. Падкрэсліце словы, якія аднолькава вымаўляюцца і пішуцца, але маюць рознае значэнне.

❖ Выпішыце з тэксту антонімы.

**176.** Дапоўніце пары сказаў адным і тым жа словам. Карыстайцеся малюнкамі-падказкамі. Запішыце сказы, у якіх словы ўжываюцца ў пераносным значэнні.



Дзяўчынкі … на сцэне.
Сняжынкі … у паветры.



Ёлка … агнямі.
Агонь … у каміне.

**177.** Прачытайце словы. Знайдзіце сярод іх сінонімы.

Рыхтавацца, збірацца, небывалы, гатавацца, ласункі, упрыгожваць, убіраць, прысмакі, незвычайны, неверагодны, аздабляць, дзіўны.



Правообладатель Национальный институт образования

**178.** Падбярыце да слоў з піраміды антонімы, якія ўтрымліваюць тую ж колькасць літар.

| | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | я́ | в | а | **с** | о | * | | | |
| | | л | е | т | а | **з** | * | * | * | | |
| | с | п | ё | к | а | **с** | * | * | * | * | |
| б | л | а | г | о | е | **д** | * | * | * | * | * |

**я́ва** — рэальнасць, а не сон ці мара

Рм **179.** Прачытайце назву тэксту і яго пачатак.

## Новы год — цудоўнае свята

Палінка і Петрык вельмі любяць Новы год. Яны пачынаюць рыхтавацца да свята загадзя…

Разгледзьце малюнак. Пазнаёмцеся з планам тэксту.





Правообладатель Национальный институт образования

План

1. Упрыгожванне пакоя.
2. Аздабленне ёлкі.
3. Лісты Дзеду Марозу.
4. Паштоўкі для бабулі і дзядулі.
5. Падарункі для таты і мамы сваімі рукамі.

Складзіце працяг апавядання пра падрыхтоўку да Новага года ў сям'і Палінкі і Петрыка. Карыстайцеся словамі з практыкаванняў 177—178.

Складзіце вуснае паведамленне пра тое, як рыхтуюцца да навагодняга свята ў вашай сям'і.

**180.** Дапоўніце сказы патрэбнымі словамі. Для гэтага перакладзіце прапанаваныя словы на беларускую мову. Запішыце сказы.

утка

1. ... адплыла ад берага. На моры пачалася

качка

... .

комната

2. Міколка прыбраў свой ... . Хвораму

покой

чалавеку патрэбны ... .

речь

3. ... вучня была дакладнай і правільнай.

вещь

Кожная ... ляжыць на сваім месцы.



Правообладатель Национальный институт образования

## ПРАВЕРЦЕ СЯБЕ

### *Адкажыце на пытанні*

1. У якім слоўніку можна даведацца пра лексічнае значэнне слова?
2. Колькі значэнняў можа мець слова?
3. Якія словы называюцца адназначнымі?
4. Якія словы называюцца мнагазначнымі?
5. Якое значэнне слова называецца прамым?
6. Як узнікае пераноснае значэнне слова?
7. Што такое сінонімы?
8. Для чаго выкарыстоўваюцца сінонімы ў тэксце?
9. Што такое антонімы?
10. Якое значэнне маюць у беларускай мове словы *рэч, пакой, гасцінец*?

### *Творчая хвілінка*

Уявіце, што ў класе праводзіцца канферэнцыя на тэму «Значэнне слова». Падрыхтуйце паведамленне з прыкладамі на адну з тэм: «Адназначныя і мнагазначныя словы», «Прамое і пераноснае значэнне слова», «Сінонімы і антонімы». Карыстайцеся інфармацыяй на форзацах.


Правообладатель Национальный институт образования